ДАРАГІЯ СЯБРЫ! З НОВЫМ НАВУЧАЛЬНЫМ ГОДАМ І ДНЁМ ВЕДАЎ!

ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

# Гомельскі універсітэт

№ 11 (967) | СЕРАДА, 1 верасня 1999 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць два разы ў месяц | Цана дагаворная

*Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь нумар 394*

**Аб прысуджэнні Гомельскаму дзяржаўнаму універсітэту імя Францыска Скарыны Ганаровага дзяржаўнага сцяга Рэспублікі Беларусь**

За асаблівыя дасягненні ў сацыяльна-культурным развіцці прысудзіць Гомельскаму дзяржаўнаму універсітэту імя Францыска Скарыны Ганаровы дзяржаўны сцяг Рэспублікі Беларусь.

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А.Лукашэнка.**

15 ліпеня 1999г.
г.Мінск.

*Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь нумар 395*

**Аб узнагароджанні работнікаў Гомельскага дзяржаўнага універсітэта імя Францыска Скарыны дзяржаўнымі ўзнагародамі Рэспублікі Беларусь**

За шматгадовую плённую навукова-педагагічную дзейнасць, вялікі асабісты ўклад у развіццё вышэйшай школы ўзнагародзіць работнікаў Гомельскага дзяржаўнага універсітэта імя Францыска Скарыны:

**Медалём "За працоўныя заслугі"**

**ЛІНА** Дзмітрыя Рыгоравіча – прарэктара па навуковай рабоце

**МАКСІМЕЯ** Івана Васільевіча – загадчыка кафедры матэматычных праблем кіравання

**Медалём Францыска Скарыны**

**СТАНКЕВІЧ** Аляксандру Аляксандраўну – загадчыка кафедры беларускай мовы

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А.Лукашэнка.**

15 ліпеня 1999г.
г.Мінск.

За шматгадовую плённую навукова-педагагічную дзейнасць, дасягнутыя поспехі ў падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў і ў сувязі з 30-годдзем стварэння Гомельскага дзяржаўнага універсітэта імя Францыска Скарыны Ганаровай граматай абласнога Савета дэпутатаў узнагароджаны **КАЛУГІН** Аляксей Савельевіч – прафесар кафедры фізіялогіі чалавека і жывёлін.

* * *

За шматгадовую плённую працу, актыўны ўдзел у грамадскім жыцці і ў сувязі з 30-годдзем стварэння Гомельскага дзяржаўнага універсітэта імя Ф.Скарыны Ганаровай граматай абласнога Савета дэпутатаў узнагароджаны **ГАПЕЕЎ** Вячаслаў Пятровіч – начальнік аддзела выхаваўчай работы з моладдзю; **ДАЛІНСКІ** Міхаіл Сямёнавіч – начальнік інфармацыйна-вылічальнага цэнтра; **САФОНАЎ** Васіль Рыгоравіч – начальнік навукова-даследчага сектара; **УСОВІЧ** Канстанцін Сяргеевіч – загадчык музея Францыска Скарыны.



**Залатая медалістка з в.Новая Гута Гомельскага раёна Анастасія Лявоненка здала экзамен па біялогіі на "выдатна" і стала першакурсніцай біялагічнага факультэта.**

## ВЫБРАНЫ ЧЛЕНАМІ-КАРЭСПАНДЭНТАМІ БЕЛАРУСКАЙ АКАДЭМІІ АДУКАЦЫІ

Яшчэ ў чатырох вучоных нашага універсітэта павысіўся навуковы статус. Членамі-карэспандэнтамі Беларускай акадэміі адукацыі пасля выбараў, якія адбыліся тут у канцы чэрвеня г.г., сталі доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар, загадчык кафедры тэарэтычнай фізікі **М.В.Максіменка**; доктар тэхнічных навук, прафесар, загадчык кафедры ВМ і праграміравання **В.В.Мажароўскі**; доктар філалагічных навук, загадчык кафедры беларускай мовы **А.А.Станкевіч** і доктар біялагічных навук, прафесар кафедры батанікі і фізіялогіі раслін **Л.М.Сапегін**.

## НАШАЙ ГАЗЕЦЕ – 30 ГАДОЎ

Рэктарат, прафком выкладчыкаў і супрацоўнікаў, прафком студэнтаў, іншыя грамадскія арганізацыі Гомельскага дзяржаўнага універсітэта імя Ф.Скарыны горача віншуюць калектыў рэдакцыі шматгранжнай газеты "Гомельскі універсітэт", усіх яе аўтараў і чытачоў са знамянальным юбілеем — 30-годдзем з дня выхаду ў свет першага нумара перыядычнага выдання.

Стварэнне друкаванага органа ў толькі што адкрытым тады нашым універсітэце ў з'явілася значнай падзеяй у жыцці шматтысячнага калектыву выкладчыкаў, супрацоўнікаў, студэнтаў і аспірантаў.

На працягу трох дзесяцігоддзяў газета імкнулася быць у авангардзе за станаўленне і развіццё вядучай вышэйшай навучальнай, навуковай і культурнай установы Беларускага Палесся, садзейнічала якаснаму паляпшэнню навучальнага і выхаваўчага працэсаў, па меры магчымасцей вяла барацьбу з меўшымі месца недахопамі.

Шчыра жадаем, каб універсітэцкая газета і ў далейшым паспяхова вырашала стаячыя перад ёю задачы, выклікала ў сваіх чытачоў яшчэ большую цікавасць, паранейшаму карысталася сярод іх папулярнасцю і ўсеагульнай падтрымкай.

## ВІНШУЕМ!

Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат, выкладчыкі і студэнты фізічнага факультэта горача віншуюць загадчыка кафедры агульнай фізікі доктара фізіка-матэматычных навук **СЕМЧАНКУ** Ігара Валянцінавіча з прысваеннем яму прэзідыумам БелВАКа вучонага звання прафесар.

* * *

Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, калектыў кафедры беларускай культуры горача віншуюць ст. выкладчыка названай кафедры, старшыню прафкома студэнтаў **КОЛТЫШАВУ** Надзею Іванаўну з паспяховай абаронай дысертацыі на атрыманне вучонай ступені кандыдата педагагічных навук.

* * *

Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, кафедра АЛФК горача віншуюць выкладчыка **БАНДАРЭНКА** Алу Яўгенаўну з паспяховай абаронай дысертацыі на атрыманне вучонай ступені кандыдата педагагічных навук.

## ПРЫСВОЕНЫ ГАНАРОВЫЯ ЗВАННІ

На апошнім Савеце універсітэта мінулага навучальнага года, якое адбылося 24 чэрвеня, званне Ганаровага доктара ГДУ імя Ф.Скарыны было прысвоена віцэ-прэзідэнту універсітэта Овернь-І, дырэктару Інстытута кіравання, садырэктару Франка-Беларускага інстытута кіравання (Клермон-Феран, Францыя) Морысу **Шэневуа**.

Нагадаем, што такое званне было прысвоена яшчэ ў лістападзе мінулага года і прафесару Пізанскага універсітэта (Італія) Гаэтана **Барлета**.

Званне Ганаровага прафесара прысвоена акадэміку НАН Беларусі, загадчыку кафедры педагогікі **І.Ф.Харламаву**; прафесару кафедры беларускай мовы **У.В.Анічэнку**; прафесару кафедры геаграфіі **В.А.Вахрушаву**.

## НАВУКОВЫ ПОШУК ДАЕ АДДАЧУ

Прадстаўляць свае тэхнічныя распрацоўкі на выстаўцы высокага рангу для навуковага калектыву — момант адказны і пачэсны. Навукова-даследчай лабараторыі "Новыя матэрыялы і тэхналогіі" фізічнага факультэта выпаў гонар паказаць свае экспанаты на выстаўцы дасягненняў беларускіх вучоных у галіне лазернай тэхнікі і тэхналогіі, якая наладжвалася летам у Інстытуце фізікі НАН Беларусі да візіту сюды Прэзідэнта рэспублікі А.Р.Лукашэнкі. Тут было прадстаўлена ўсё лепшае, што распрацавана ў гэтай галіне.

Даследчыкі-распрацоўшчыкі універсітэцкай лабараторыі, у якой працуюць навуковыя супрацоўнікі В.Мышкавец, А.Максіменка, аспірант Ю.Нікіцюк, студэнт-выпускнік фізічнага факультэта І.Каморнікаў на чале з дацэнтам С.В.Шалупаевым, дэманстравалі на ёй узоры лазернай тэхнікі рэзкі металічных і неметалічных металаў (кераміка, шкло і інш.), лазернай зваркі, лазерная тэрмаўмацавання і інш. Першая з названых распрацовак знайшла практычнае прымяненне — укаранёна на заводзе "Модуль" вытворчага аб'яднання "Карал".

Прадстаўленым на выстаўцы экспанатам гомельскіх фізікаў кіраўнік дзяржавы даў высокую ацэнку. Гэта падкрэсліў у сваім падзякаваным пісьме, дасланым у ГДУ на адрас рэктара Л.А.Шаматкова, прэзідэнт Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі акадэмік А.П.Вайтовіч.

**Т.ДУБЯК.**

## МІЖНАРОДНАЯ ШКОЛА-СЕМІНАР

Развіццю навукі ў Беларусі ў многім садзейнічаюць міжнародныя сімпозіумы, канферэнцыі і семінары па розных напрамках навуковага пошуку, якія праводзяцца на тэрыторыі рэспублікі. Для Гомельшчыны сталі традыцыйнымі міжнародныя школы-семінары па актуальных праблемах фізікі мікрасвету. Такія школы праводзіліся на базе пансіяната "Залатыя пяскі" у 1971, 1973, 1977 і 1997 гадах. Чарговая школа-семінар праходзіла тут ж у канцы ліпеня - пачатку жніўня гэтага года. Яе арганізатарамі з'яўляліся Аб'яднаны інстытут ядзерных даследаванняў, Нацыянальны цэнтр фізікі часціц і высокіх энергій, Інстытут фізікі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, ГДУ імя Ф.Скарыны, Інстытут механікі металапалімерных сістэм імя У.А.Белага, ГТУ імя П.О.Сухога, БелДУТ.

Лекцыі і даклады на семінары былі прадстаўлены вучонымі якіх устаноў-арганізатараў гэтага мерапрыемства, так і сусветна вядомых навуковых цэнтраў ЗША, ФРГ, Швейцарыі, Францыі, Італіі, Чэхіі, Аўстрыі, некаторых краін СНД.

Ад нашага універсітэта ў рабоце школы-семінара прынялі ўдзел і выступілі з дакладамі загадчык кафедры тэарэтычнай фізікі прафесар М.В.Максіменка, дацэнты гэтай кафедры В.М.Капшай і В.В.Андрэеў.

**Вопыт**

## ВУЧОНЫЯ – СПАРТСМЕНАМ

Нядаўна ў Мінску адбыўся міжнародны навуковы кангрэс "Фізічная культура, спорт, турызм у новых умовах развіцця краін СНД". Адным з яго ўдзельнікаў быў загадчык кафедры фізічнага выхавання і спорту нашага універсітэта кандыдат педагагічных навук, дацэнт, заслужаны трэнер Беларусі Віктар Каляда.

— Падобны кангрэс вучоных СНД праводзіўся ўпершыню, — сказаў ён. — У яго рабоце прымалі ўдзел кіраўнікі Расійскага і Беларускага НДІ фізічнай культуры, вучоныя, вядомыя спартсмены і трэнеры. Гомельшчына была прадстаўлена трыма ВНУ — ГДУ імя Ф.Скарыны, Гомельскім дзяржаўным тэхнічным універсітэтам ім. П.Сухога і медінстытутам. На кангрэсе разглядаліся і абмяркоўваліся пытанні стану здароўя, фізічнага развіцця, падрыхтаванасці розных дэмаграфічных груп насельніцтва краін СНД. Абмеркавана тэма спорту, турызму як умовы інтэграцыі сацыяльна-эканамічнага развіцця, форм, сродкаў і метадаў фізічнага выхавання насельніцтва на тэрыторыях, пацярпеўшых ад экалагічных і тэхнагенных катастроф. Гаварылі мы і аб медыка-біялагічных праблемах фізічнай культуры і спорту.

Да сказанага дададзім, што больш за ўсіх работ на кангрэсе — 25 — прадставілі вучоныя Гомельшчыны. Дэлегацыя нашай вобласці была таксама самай прадстаўнічай — 14 чалавек.

Былі адзначаны даклады загадчыкаў кафедр нашага універсітэта В.А.Каляды і М.Р.Кошмана, дацэнта У.А.Мядзведзева.

Такім чынам, вучоныя ўносяць свой уклад у развіццё фізкультуры і спорту. А без іх намаганняў дасягнуць добрых вынікаў у аздараўленні насельніцтва, як і ў вялікім спорце, немагчыма.

# СТАНУЦЬ СПЕЦЫЯЛІСТАМІ НОВАГА СТАГОДДЗЯ

## Да вынікаў уступных экзаменаў — 99 ва універсітэт

*Мінуў месяц, як завяршыліся ўступныя экзамены ў наш універсітэт. Яны прынеслі шмат перажыванняў і хваляванняў не толькі абітурыентам, але і іх бацькам. Для самых падрыхтаваных усё скончылася бязмежнай радасцю — паспяхова пераадолены конкурсны бар'ер, прадставілася магчымасць набываць абраныя спецыяльнасці, каб ужо ў новым стагоддзі найбольш эфектыўна прымяняць на практыцы свае прафесійныя веды.*

*Тыя ж, хто сёлета не здолеў ажыццявіць сваю мару, не павінны расчаравацца. Ім трэба больш грунтоўна рыхтавацца да наступных выпрабаванняў. Настойлівасць і мэтанакіраванасць гарантуюць перамогу ў конкурснай барацьбе.*

*Сёння ж рэктарат, грамадскія арганізацыі, выкладчыкі і студэнты горача віншуюць чарговае папаўненне нашага універсітэта, жадаюць першакурснікам добрай і выдатнай вучобы, актыўнага ўдзелу ва ўзбагачэнні і памнажэнні лепшых традыцый вядучай вышэйшай навучальнай, навуковай і культурнай установы Беларускага Палесся.*

*Вы, дарагія першакурснікі, павінны заўсёды памятаць і ганарыцца тым, што паступілі на вучобу ў ГДУ ў тройчы юбілейны для яго год. Сёлета мы адзначым 70-годдзе, як была прынята пастанова аб адкрыцці нашай ВНУ, на базе якой 30 гадоў таму быў створаны другі ў Беларусі універсітэт, які адзінаццаты год з гонарам носіць імя славутага славянскага першадрукара, вучонага і асветніка Францыска Скарыны. Сёння 30-гадовы юбілей адзначае і наша газета "Гомельскі універсітэт".*

### Новыя спецыяльнасці і адзнакі

Даведзеным для нашага універсітэта планам сёлета за дзяржаўныя сродкі навучання прадугледжвалася набраць 990 першакурснікаў — на 15 больш, чым летась. Да 27 раней існуючых дабавілася яшчэ адна спецыяльнасць — "Сусветная эканоміка і міжнародныя эканамічныя адносіны". Яе адкрыццё прадыктавана патрэбнасцю ў такіх спецыялістах пасля набыцця нашай краінай суверэнітэту і незалежнасці і яе шырокага выхаду на міжнародную эканамічную арэну. Пры гэтым для гарадскіх і сельскіх абітурыентаў быў устаноўлены паасобны конкурс.

Адметнасцю цяперашніх уступных экзаменаў з'явілася ўстанаўленне новых адзнак — "3,5" і "4,5" — пры ацэнцы пісьмовых работ і ў парадку эксперымента па вуснаму экзамену па "Беларускай мове і літаратуры са спецыялізацыяй "Англійская мова".

Каб забяспечыць роўныя правы і магчымасці для правядзення ўступных экзаменаў, ва універсітэце, як і ў папярэднія гады, працавалі патрабавальныя і разам з тым добразычлівыя камісіі Камітэта дзяржаўнага кантролю, найбольш вопытных педагогаў Гомеля, вобласці і інш.

Для паступлення ў ГДУ былі пададзены дакументы ад 1871 абітурыента (летась — 2151) Беларусі і Расіі. На кожнае месца прэтэндавала 1,9 чалавека — на 0,35 менш мінулагодняга.

У ліку першых атрымалі права быць залічанымі на першы курс 65 слухачоў падрыхтоўчага аддзялення, якія здалі выпускныя экзамены без здавальняючых адзнак.

Напярэдадні асноўных іспытаў адбылося субяседаванне з медалістамі сярэдніх школ найбольш пацярпелых ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС раёнаў Гомельшчыны. 49 такіх абітурыентаў былі рэкамендаваны да залічэння на педагагічныя спецыяльнасці.

Без экзаменаў былі залічаны ва універсітэт таксама 10 пераможцаў рэспубліканскіх і абласных і 33 — універсітэцкіх прадметных алімпіяд.

Усіх астатніх абітурыентаў чакала нялёгкае выпрабаванне на вусных і пісьмовых іспытах.

### Перад выпрабаваннем на веды

Самы высокі конкурс склаўся на спецыяльнасць "Бухгалтарскі ўлік, аналіз і аўдыт" — 2,85 чалавека на месца. Але яе абітурыенты аказаліся найменш падрыхтаванымі: уступныя экзамены вытрымалі толькі 42 працэнты паступаўшых.

Другі паказчык прыпадае на новую спецыяльнасць "Сусветная эканоміка і міжнародныя эканамічныя адносіны". За права заняць адно з 20 планавых месц змагаўся 51 прэтэндэнт на набыццё сучаснай прэстыжнай прафесіі.

Па 2,5 чалавека на месца была конкурсная планка на спецыяльнасцях "Эканоміка і кіраванне на прадпрыемстве" і "Фізічная культура і спорт". Усяго на адну дзесятую гэты паказчык быў меншы ў паступаючых на спецыяльнасць "Псіхалогія" і яшчэ на пяць сотых — у будучых эколагаў.

Самая большая колькасць абітурыентаў — 170 — падалі заявы на правазнаўства — 2,25 чалавека на месца. Такі ж конкурс зафіксаваны сёлета і на спецыяльнасць "Камерцыйная дзейнасць". Амаль раўназначным ён быў і яшчэ на адну эканамічную спецыяльнасць — "Фінансы і крэдыт".

Паглыбляць веды па нямецкай мове жадалі 53 абітурыенты, у 25 з якіх мэта здзейснілася.



**Член дзяржаўнай камісіі, галоўны спецыяліст Камітэта дзяржаўнага кантролю па Гомельскай вобласці У.М.Лапуноў (у цэнтры), старшыня прадметнай камісіі дацэнт У.М.Семянчук (злева) і член грамадскай камісіі настаўнік гомельскай СШ № 69 У.Я.Еўдакімовіч абмяркоўваюць вынікі ўступнага экзамена па матэматыцы.**

Аднолькавым аказаўся конкурс — па 2 чалавекі на месца — на філалагічныя спецыяльнасці "Руская мова і літаратура" і "Беларуская мова і літаратура".

Агульнаму сярэднеуніверсітэцкаму паказчыку — 1,9 чалавека на планавае месца — адпавядае конкурс на спецыяльнасці "Прыкладная матэматыка" і "Біялогія". Адпаведна 1,8 і 1,75 ён быў на спецыяльнасцях "Руская мова і літаратура" са спецыялізацыяй "Беларуская мова і літаратура", "Англійская мова" і "Геаграфія".

На кожнае вакантнае месца на спецыяльнасці "Гісторыя", "Гісторыя і англійская мова" прэтэндавалі адпаведна 1,7 і 1,45 чалавека на месца.

Асобна хочацца сказаць пра спецыяльнасць "Беларуская мова і літаратура" са спецыялізацыяй "Англійская мова". На яе паступаў 41 чалавек. Толькі двое з іх не вытрымалі экзаменаў. Гэта самы высокі працэнт паспяховасці ва універсітэце на сёлетніх уступных выпрабаваннях. Дарэчы, конкурс тут быў невысокі: 1,6 чалавека на месца.

Не зусім напружанай была барацьба ў будучых геолагаў. На 25 планавых месц паступіла 38 заяў. Для 13 абітурыентаў экзамены аказаліся не пад сілу. Тыя, хто вытрымаў іх, засталіся без канкурэнтаў.

Па пяці спецыяльнасцях рыхтуе маладыя кадры фізічны факультэт. Аднак за апошнія гады яго прэстыжнасць рэзка ўпала. Не сталі выключэннем і сёлетнія ўступныя экзамены. Тут зноў быў самы нізкі конкурс — у межах ад 1,2 да 1,5 чалавека на месца. Апошняя лічба адносіцца да спецыяльнасці "Фізічная электроніка", на якую пасля праверкі на веды па набраных балах не прайшлі ўсяго 2 чалавекі. На астатнія чатыры спецыяльнасці названага факультэта экзамены вытрымалі (магчыма, з пэўнай нацяжкай) па 25 чалавек. І ўсе яны сталі першакурснікамі.

### Стракатасць прахадных балаў

Наколькі ўспамінаецца, перад уступнымі экзаменамі многія абітурыенты і іх бацькі цікавяцца прахаднымі баламі на тую ці іншую спецыяльнасць. Скажам адразу: загадзя адказаць дакладна на гэта пытанне проста немагчыма. Прахадныя балы залежаць ад некалькіх фактараў. Тут і колькасць абітурыентаў на планавыя месцы, і ўзровень ведаў паступаючых, іх псіхалагічная ўстойлівасць і некаторыя іншыя патрабаванні да іспытуемых. Каму з іх пашчасціць стаць першакурснікамі, вызначаюць канчатковыя вынікі экзаменаў, якія прадугледжаны ўступнымі правіламі іх правядзення.

Сёлета самы высокі прахадны бал склаўся адпаведна на спецыяльнасцях "Англійская мова" — 17,5 (летась 16) і "Нямецкая мова" — 17 (15), "Правазнаўства" — 16 (17), для паступлення на якія здавалі па чатыры экзамены.

На сем спецыяльнасцей неабходна было набраць па 12,5 бала. Гэта — "Беларуская мова і літаратура" са спецыялізацыяй "Англійская мова" (у мінулым годзе — 13), "Матэматыка" (11), "Гісторыя" з дадатковай спецыяльнасцю "Англійская мова" (12), "Экалогія" (12), "Псіхалогія" (11), "Біялогія" (9), "Фізічная культура і спорт" (12). Варта зазначыць, што сёлета найбольш прыкметна — на 3,5 бала — узрос прахадны рубеж на біялагічны факультэт, які ў папярэднія два гады па гэтаму паказчыку быў сярод адстаючых.

12 балаў сталі прахаднымі на спецыяльнасці "Беларуская мова і літаратура" (13), "Сусветная эканоміка і міжнародныя эканамічныя адносіны" (для гарадскіх абітурыентаў), "Прыкладная матэматыка" (12), "Гісторыя" (13).

Парадаваліся і тыя абітурыенты, якія набралі па 11,5 бала пры паступленні на спецыяльнасці "Руская мова і літаратура" (12), "Руская мова і літаратура" са спецыялізацыяй "Беларуская мова і літаратура" (12), "Эканоміка і кіраванне на прадпрыемстве" (12), "Прыкладная матэматыка" (12).

Прапускнымі ва універсітэт аказаліся набраныя 11 балаў на спецыяльнасці "Фінансы і крэдыт" (12) і "Геаграфія" (14). Звярніце ўвагу на апошнюю з іх, дзе зафіксавана найбольшае зніжэнне прахадного бала.

Пакуль што не набыла папулярнасці спецыяльнасць "Фізічная электроніка", на якую дастаткова было набраць 10,5 бала пры леташніх 11. Аналагічныя вынікі і на спецыяльнасці "Бухулік, аналіз і аўдыт".

Двух троек і адной чацвёркі хапіла для таго, каб быць залічаным на спецыяльнасці "Камерцыйная дзейнасць" (12), "Фізіка" — педагагічнае аддзяленне (11), "Фізіка" з дадатковай спецыяльнасцю "Тэхнічная творчасць" (10), "Аўтаматызаваныя сістэмы апрацоўкі інфармацыі" (12).

Для абітурыентаў з сельскай мясцовасці, якія паступалі на спецыяльнасць "Сусветная эканоміка і міжнародныя эканамічныя адносіны", прахаднымі аказаліся 9,5 бала.

Абітурыенты спецыяльнасці "Геалогія і разведка карысных выкапняў" і вытворчага аддзялення фізічнага факультэта зоймуць месцы ў аўдыторыях, здаўшы ўступныя экзамены толькі на "здавальняюча". Гэта адпаведна на два і адзін бал менш, чым летась.

У цэлым жа па універсітэту ў параўнанні з леташнім прахадныя балы аказаліся вышэйшымі па 8 спецыяльнасцях, а па 17 — ніжэйшымі. На 17 спецыяльнасцей залічаны абітурыенты з паўпрахаднымі баламі. Гэта не тычыцца "Рускай мовы і літаратуры" са спецыялізацыяй "Беларуская мова і літаратура", "Камерцыйнай дзейнасці", "Фінансаў і крэдыту", "Сусветнай эканомікі і міжнародных эканамічных адносін" для сельскіх абітурыентаў, "Прыкладной матэматыкі", "Фізікі" з дадатковай спецыяльнасцю "Тэхнічная творчасць", АСАІ, "Гісторыі", "Геаграфіі", "Біялогіі".

### "За бартом" — медалісты

На працягу многіх гадоў вядзецца размова аб тым, што страчваюць сваю каштоўнасць залатыя і сярэбраныя медалі, якія выдаюцца значнай колькасці выпускнікоў школ. Сведчаннем таму — вынікі ўступных экзаменаў у ВНУ Беларусі, у тым ліку і ў наш універсітэт. Цяжка пералічыць усіх уладальнікаў гэтых ганаровых узнагарод, не здолеўшых на адказных іспытах пацвердзіць свае выдатныя веды. І яшчэ не бяда, калі выстаўляецца становучая адзнака. Трывогу выклікаюць нярэдкія правалы медалістаў, тое, што некаторыя з іх не могуць адказаць на элементарныя пытанні.

Прыкладаў для пацвярджэння сказанага больш чым дастаткова. У прыватнасці, сёлета ў наш універсітэт паступалі 384 медалісты. З іх сваю запаветную мару ажыццявілі 283 або 73,7 працэнта. Толькі па васьмі спецыяльнасцях у лік першакурснікаў залічаны ўсе паступаючыя медалісты. Сярод іх — дзве рускага аддзялення філфака. Варта назваць і спецыяльнасць "Матэматыка". На яе паступала найбольшая колькасць медалістаў — 46, з якіх 42 сталі першакурснікамі. Ад іх колькасці гэта складае 57,3 працэнта — самы высокі паказчык па універсітэту.

Значна адрозніваецца гэта лічба па юрыдычнаму факультэту. Сёлета на яго паступала 42 медалісты. Экзамены і прахадны бал аказаліся пад сілу толькі 23 з іх.

Многія медалісты, якія сёлета паступалі ва універсітэт, не справіліся з экзаменамі па пісьмовай матэматыцы, біялогіі і некаторых іншых дысцыплінах.

Не лепшым чынам зарэкамендавалі сябе і ўладальнікі дыпломаў з адзнакай, якія былі выдадзены нашым абітурыентам па заканчэнні сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў і ПТВ. З 13 паступаючых толькі 7 атрымалі права набываць вышэйшую адукацыю ў ГДУ.



**Члены прыёмнай камісіі па матэматыцы (злева направа) дацэнты А.Ф.Каморнікаў і А.В.Бузланаў прымаюць экзамен у Мікалая Кончыца. Яго веды ацэнены вышэйшым балам. Мікалай стаў студэнтам спецыяльнасці "Аўтаматызаваныя сістэмы апрацоўкі інфармацыі".**

### Ва універсітэт залічаны

- На аснове поўнай аплаты за навучанне — 140 чалавек.
- 407 юнакоў і дзяўчат, якія закончылі падрыхтоўчае аддзяленне і падрыхтоўчыя курсы ГДУ, спецкласы.
- 309 абітурыентаў сталі першакурснікамі па мэтаваму кантрактнаму набору.
- 108 першакурснікаў закончылі ліцэі і гімназіі.
- Працэнт вытрымаўшых уступныя экзамены і залічаных сельскіх абітурыентаў — 48,4, гарадскіх — 40,2.
- З працоўным стажам не менш 2-х гадоў з паступаючых 17 чалавек прайшлі па льготнаму конкурсу 2.
- Ва універсітэт паступаў 71 грамадзянін Расійскай Федэрацыі. Як і летась, права вучыцца ў вядучай ВНУ Беларускага Палесся атрымалі 22 чалавекі. Па трое з іх будуць набываць вышэйшую адукацыю на юрфаку і факультэце фізічнай культуры і спорту.

**По дадзеных прыёмнай камісіі матэрыял да публікацыі падрыхтаваў Ул. БАЛОГА.**
**Фота М.Бяльковіча.**

